**Білет 3**

**Практычнае заданне.**
**Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**
1. Якія прынцыпы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь?
2. У чым Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка бачыць галоўную ўмову дэмакратычнага ладу свету?
3. Якім чынам Рэспубліка Беларусь рэалізуе заяўленае ў Канстытуцыі права "ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні"? Прывядзіце факты.
4. Складзіце схему, якая пацвярджае шматвектарны характар знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.

**I. З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь** *(у рэдакцыі 15.03.2022 г.)*
**Артыкул 8.** Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства.
Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права можа на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх.
Не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі.
**Артыкул 18.** Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права. Рэспубліка Беларусь выключае ваенную агрэсію са сваёй тэрыторыі ў дачыненні да іншых дзяржаў.

**II. Аб прыярытэтных напрамках знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь** *(па матэрыялах сайта Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь)*

Прытрымліваючыся адзіных падыходаў да развіцця адносін з усімі замежнымі партнёрамі на аснове раўнапраўнага і ўзаемапаважлівага дыялога, Беларусь у той жа час, як і любая іншая дзяржава, канцэнтруе свае знешнепалітычныя намаганні на шэрагу найбольш важных і перспектыўных вектараў. Сярод іх - перш за ўсё Расійская Федэрацыя, стратэгічнае саюзніцкае ўзаемадзеянне з якой будуецца на аснове Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Адносіны ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства развіваюцца з Кітайскай Народнай Рэспублікай.

Паслядоўна адстойваючы ідэі інтэграцыі, Беларусь займае актыўную і канструктыўную пазіцыю ў аб'яднальных утварэннях на постсавецкай прасторы - Еўразійскім эканамічным саюзе, Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Завершаны ўнутрыдзяржаўныя працэдуры ў рамках абавязацельстваў Беларусі для атрымання статусу дзяржавы - члена Шанхайскай арганізацыі

супрацоўніцтва. Беларусь падала афіцыйную заяўку на далучэнне да фармату БРІКС у якасці ўдзельніка.

На якасна новы ўзровень выходзіць узаемадзеянне з краінамі "далёкай дугі" беларускай знешняй палітыкі - Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

На фоне беспрэцэдэнтнага палітычнага і эканамічнага націску Еўрапейскага саюза, ЗША і іншых краін Захаду на Беларусь адносіны з імі трансфармаваліся з партнёрскіх і ўзаемавыгадных у жорсткае супрацьстаянне. Разам з тым Беларусь застаецца адкрытай для дыялогу з заходнімі краінамі з мэтай выхаду на пазітыўную траекторыю супрацоўніцтва, найперш у гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах.

Важным напрамкам знешнепалітычнай актыўнасці Беларусі з'яўляецца шматбаковая дыпламатыя. Наша краіна імкнецца ўнесці свой уклад у вырашэнне глабальных праблем, процідзеянне сучасным выклікам і пагрозам, традыцыйна актыўна ўдзельнічае ў дзейнасці ААН і іншых міжнародных арганізацый, генерыруе падыходы і ініцыятывы, якія прапануюць парадак дня, які аб'ядноўвае ўсіх членаў міжнароднай супольнасці, садзейнічае дыялогу і пераадоленню раздзяляльных ліній.

**III. Беларусь у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый** (*па матэрыялах вучэбнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас"*).

Беларусь з самага пачатку сваёй знешнепалітычнай дзейнасці пацвердзіла прыхільнасць да прынцыпаў Статута ААН і Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека.

Наша краіна ў 2000 г. падпісала на саміце ў Нью-Йорку Дэкларацыю тысячагоддзя. Гэты дакумент накіраваны на дасягненне мэт, звязаных з паляпшэннем становішча чалавека, пераадоленнем беднасці, галечы і голаду, умацаваннем здароўя, устанаўленнем міру і забеспячэннем бяспекі, аховай навакольнага асяроддзя, абаронай правоў дэмакратыі.

Беларусь выступае за рэфармаванне дзейнасці ААН, накіраванае на ўмацаванне яе патэнцыялу для рэагавання на сучасныя выклікі і пагрозы.

На паседжанні сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у 2005 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка адзначыў: «ААН - гэта мы. Менавіта мы з вамі павінны ўзяць лёс планеты ў свае рукі. Мы з вамі павінны зразумець, што аднапалярны свет - гэта свет адналінейны. Больш за тое - аднамерны. Мы з вамі павінны ўсвядоміць… Свабода выбару шляху развіцця – галоўная ўмова дэмакратычнага ладу свету. Дзеля гэтага і стваралася нашая Арганізацыя. …Калі мы пагодзімся адзін з адным у гэтым, галоўным, то мы ўвасобім прынцыпы шматпалярнасці, разнастайнасці, свабоды выбару… Тады і ААН стане арганізацыяй па-сапраўднаму аб'яднаных нацый…».